БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 8 (90)
сакавік
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

Самыя лепшыя!

с.4-5

KAMUNIKAT.org

Існасць с.2

Вокны с.3

Памяць с.8



Песнь Пресвятой Богородице

Мира заступница, Матерь Всепетая,
Я пред Тобою с мольбой,
Бедную грешницу, мраком одетую,
Ты благодатью прикрой.
Если постигнут меня испытания,
Скорби, утраты, враги,
В трудный час жизни,
в минуты страдания
Ты мне, молю, помоги.
Радость духовную, силу спасения
В сердце моём оживи,
В Царство небесное, мир утешения
Путь мне прямой укажи.
В скорби ль душа унывает бессильная,
Жизнь ли измучит борьбой,
Вся пред Тобою, о, Мати Всепетая,
Я преклоняюсь с мольбой.
Знаю я силу иконы целительной,
Знаю я милость Твою
И пред Тобою с надеждой живительной
Вся я в слезах предстаю.
Можешь ты скорбь облегчить мне
несносную,
Радость духовную дать.
Скоро Ты можешь излить животворную
В душу мою благодать.
О, утоли же печаль безутешную
И помоги же любя.
Скоро услыши меня многогрешную,
С верой молю я Тебя.

Епископ Могилёвский и Мстиславский СОФРОНИЙ: «СОВЕСТЬ -- ГОЛОС БОЖИЙ».

«...Нельзя утверждать, что спасутся все те, кто именует себя христианами, кто принял крещение. Спасутся те, кто живёт согласно Закону Божиему и кто свою веру подтверждает добрыми делами. Как сказано в Священном писании -- вера без дел мертва. Бывает, что человек крещён, ходит в храм, а выйдя их него, творит беззаконие. Напротив, бывает, что добрый по природе человек не делает зла, но не воцерквлён, не участвует в церковных таинствах. Такая жизнь не спасает человека. Спасает человека Бог.

Апостол Павел говорит, что людей, которые не знали Христа, Бог будет судить по их совести, так как совесть -- голос Божий. Жизнь всех людей во власти Господа. Один Бог знает, как будет их судить».

"Утоли моя печали"

Название чудотворной иконы Божией Матери «Утоли моя печали» говорит о том, что к Царице Небесной обращаются через этот образ в поисках утешения в скорбях и печалях. «От всяких нас бед свободи, избавь нас от всякого зла и утоли наши печали» -- так звучат слова молебна у иконы.

По преданию 7 февраля (25 января по ст.стилю) 1760 г. одной знатной женщине, страдавшей параличом ног и рук, во сне явилась икона Божией Матери, был показан храм, где она пребывала. Чей-то голос велел ехать в Москву и молиться перед этим образом. Когда больная нашла церковь, то узнала в ней икону из сна, а после совершения молебна перед ней, приложившись к святыне, получила исцеление.

Позже от иконы «Утоли моя печали», которой молятся в самых отчаянных ситуациях, об избавлении от болезней и греховных страстей, произошло много чудес. Сегодня чудотворный образ находится с московском Николо-Кузнецком храме. Прославились чудотворениями и списки этой иконы.

ДВА ДРУГА. *Притча.*

Однажды друзья поспорили, и один из них дал пощёчину другому. Последний, чувствуя боль, но ничего не говоря, написал на песке: *«Сегодня мой самый лучший друг дал мне пощёчину».*

Друзья продолжали идти и нашли оазис, в котором решили искупаться. Тот, который получил пощёчину, едва не утонул, и друг его спас. Когда тонувший пришёл в себя, то выбил на камне: *«Сегодня мой самый лучший друг спас мне жизнь».*

Тот, кто дал пощёчину и спас жизнь своему другу, спросил его:

-- Когда я тебя обидел, ты написал на песке, а теперь ты пишешь на камне. Почему?

Друг ответил:

-- Когда кто-либо из нас обижает, мы должны написать это на песке, чтобы ветры могли стереть это. Но когда кто-нибудь делает что-либо хорошее, мы должны выбить это на камне, чтобы никакой ветер не смог стереть это.

ЗАМОВА АД БЯССОНІЦЫ

"Нашнік-нашнік, жалезны сашнік, адкуль прыйшоў, туды пайшоў, адкуль прыехаў, туды паехаў, адкуль прыляцеў, туды паляцеў. За марамі, за балатамі зарэзалі сем кабаноў, сем бараноў, сем бугаёў. Там кухары гатавалі, скрыпачы іграліі, з раба (імя) нашнікі знімалі".

Сонца ў вокнах

Ю М.Колбік за працай.

Кіраўніцтва Кадзінскай школы займаецца не толькі вучэбным працэсам, але цікавіцца і тым, у якіх умовах жывуць вучні. У прыватнасці, была звернута ўвага на вокны кватэры ў доме № 8 па вуліцы Юбілейнай у Брылях, дзе жывуць Сяргей і Аляксандр Малдаванавы, -- пабітае шкло, кавалкі паліэтылену. Было вырашана змяніць эстэтычны выгляд, і 10 сакавіка за працу ўзяўся майстар сваёй справы, сталяр Кадзінскай школы Юрый Мікалаевіч Колбік. Праз пэўны час усё кардынальна памянялася, і ў новым чыстым шкле адлюстраваліся веснавыя аблокі. А кіраўніцтва школы, пайшоўшы на пэўныя фінансавыя выдаткі, спадзяецца, што Малдаванавы будуць берагчы тое, што атрымалі.

Зіхаціць новае шкло...

А тым часам...



Брылеўскі полтэргейст.

А тым часам у суседнім доме № 6 нешта вухнула і зазвінела -- гэта ў кватэры, якую займае Аляксандр Аляксандравіч Капытаў у чарговы раз пасыпалася акно. Пётр Уладзіміравіч Магілёўцаў, ідучы мімаходзь, прыпыніўся, паглядзеў на бліскучыя рэшткі і філасофскі-задуменна працягнуў: "Да-а-а!.."

Я потым спытаў у А.Капытава: "А што гэта было?" І той неяк загадкава адказаў: "Ды зачапілі!" Як можна было зачапіць шкло ад вуліцы пры зачыненай унутранай раме -- загадка. Але факт, як кажуць, у наяўнасці. Можа, тут які брылеўскі полтэргейст?..

Як кажуць жыхары гэтага дома, пад тымі вокнамі заўсёды было страшнавата хадзіць, бо гэта ўжо не першы выпадак такога полтэргейста. Па перыметру кватэры у тых рамах практычна жывога месца і не засталося. Шчасце, што ніхто яшчэ не пакалечыўся...

Мікола ЯЦКОЎ.

П.Магілёўцаў аглядае вынікі дзіўнай з'явы.

"Нашы мамы

Так сталася, што менавіта 13 сакавіка 2009 года вучні Брылеўскай школы-сада адзначылі светлае веснавое свята -- міжнародны жаночы дзень. Да гэтай даты была прымеркавана школьная ўрачыстасць, падрыхтаваная вучнямі пад кіраўніцтвам настаўніцы Іны Фёдараўны Пракопчык. Гучалі віншаванні мамам, песні, загадкі. Было некалькі маленькіх інсцэніровак, у якіх удзел прымалі настаўнікі Тамара Трафімаўна Жураўкова, Валянціна Макараўна Мяшкова і Марына Міхайлаўна Бірукова. Ансамбль хлопчыкаў з дапамогай баяніста Мікалая Адамавіча Яцкова выканаў жартоўныя прыпеўкі. Было шмат гульняў -- і спартыўных, і інтэлектуальных. І асабліва запомнілася тая, дзе трэба было з дапамогай туалетнай паперы зрабіць "мумію". А напрыканцы былі танец і агульная песня. І было бачна, з якім добрым настроем удзячныя гледачы ўспрынялі падоранае ім свята.

Ала ЯЦКОВА,
бібліятэкар Брылеўскай бібліятэкі.

І.Ф.Пракопчык

М.Пухоўская

Н.А.Ярмаш


А.Трухмінаў, К.Куляшоў, А.Аляксейкоў, К.Пятроў

Г.Ермалаева

Т.Т.Жураўкова

З.Мяшкоў

К.Мухортава


М.М.Бірукова і Т.Ф.Прудзікава


Д.Старс


Я.Бірукоў

А.М.Яцкова, К.Бірукова, Я.Какоўка, Я.Пшанічная

М.Жукаў

А.Жукаў

лепей за ўсіх!"

А.У.Аляксейкова

А.Аляксейкоў, Я.Какоўка і К.Бірукова падрыхтавалі віншаванні.

Прыпеўкі



М.М.Бірукова, К.Бірукова і В.М.Мяшкова

А. і В.Куляшовы

К.Паршнёва

А.Куляшова

Р.Жукава

Вось так робіцца мумія...

Я.Какоўка, Я.Пшанічная, К.Бірукова і Н.Журава

К.Пятроў і А.Пухоўскі: хто хутчэй?

"Пусть всегда будет мама!"

Фотаздымкі Міколы Яцкова і Алы Яцковай

Перамога!

Праўду кажуць: кропля камень точыць.... Чытачы "Брылеўскага летапісу" памятаюць гісторыю Веры Андрэеўны Трышкінай, якая, засяліўшыся ў кватэру ў доме па вуліцы Юбілейнай у Брылях, пачала атрымліваць з "Жылкамгасу" разліковыя квітанцыі па квартплаце з амаль паўмільённымі сумамі запазычанасці. Справа ў тым, што гэтыя грошы былі павінны папярэднія кватэраздымшчыкі, але так і не аддалі. І нейкім хітрым чынам доўг аўтаматычна перайшоў на В.Трышкіну. І пачала яна звяртацца ў "Жылкамгас", у выканкам сельсавета, зноў у камунгасаўскую кантору, прычым, і не па аднаму разу, але, як казаў калісьці класік літаратуры -- "Всё то же, то же, только нет убитых сил, прожитых лет". Прыйшлося і нашаму выданню аж два разы падымаць на сваіх старонках гэтае пытанне. І трэба сказаць, што ў выніку вялікіх намаганняў лёд скрануўся і станоўчае рашэнне ў дачыненні да праблемы В.Трышкінай было прынята: літаральна днямі яна паведаміла, што тыя фантастычныя лічбы з квітанцый зніклі. Трэба дадаць, што зніклі яны і з квітанцый В.А.Цеплякова, які сутыкнуўся з ідэнтычнай праблемай і пра якога таксама ўзгадваў "Брылеўскі летапіс". Так што не толькі В.Трышкіну і В.Цеплякова можна павіншаваць з перамогай, але і ўсіх нас.

Аб чым гэта гаворыць? Толькі аб адным: калі цябе "заціснулі", а ты бачыш, што гэта несправядліва -- змагайся. Толькі так! У нас ёсць не толькі абавязкі, але і правы. І мы павінны *людзьмі* звацца.

Мікола ЯЦКОЎ.

Прапаную чытачам "БЛ" урывак з інтэрв'ю вядомага рускага паэта Яўгена Рэйна, надрукаванага у "Литературной газете", дзе ён ўзгадвае абставіны смерці У.Маякоўскага і С.Ясеніна і акалічнасці, якія суправаджалі тыя трагічныя падзеі. З поўным тэкстам інтэрв'ю можна азнаёміцца, наведаўшы чытальную залу нашай бібліятэкі.

Ала ЯЦКОВА,
бібліятэкар Брылеўскай бібліятэкі.

Евгений Рейн

-- По поводу Маяковского и Есенина гуляют легенды, что их самоубийства были подстроены.

-- Это ерунда. Вы знаете, я этим вопросом очень интересовался и занимался. Существуют же простые факты. История конца Есенина или конца Маяковского известны практически досконально. Я, например, лично очень хорошо знал Веронику Полонскую, которая находилась в квартире, когда прозвучал тот роковой выстрел. И когда она вбежала в комнату, то в воздухе ещё не рассеялся пороховой дым, а сам Маяковский ещё дышал. Посторонних там и близко не было. И все эти дикие люди, которые говорят, об убийстве Есенина, -- они сами ничего толком не знают и ничего не могут предъявить в доказательство своих слов. Якобы он вмешался в партийную борьбу и имел какой-то "компромат", -- полнейшая чушь.

-- Да чекисты могли бы ликвидировать Есенина в более подходящем месте. При его-то образе жизни...

-- Конечно! Есенин ведь всю свою жизнь дружил с чекистами, а "Англетер" была их ведомственная гостиница. Его туда и поселили приятели-чекисты. Зачем им нужно было устраивать эту "подставу" с гостиницей и убивать Есенина в 1925 году? Они могли сделать это гораздо раньше. Могли в любой пьяной драке его пристукнуть, сбить автомобилем, подсыпать что-то в бокал, да всё что угодно. Так что и в случае с Маяковским, и в случае с Есениным -- это, безусловно, самоубийства. Разумеется, много факторов здесь сыграло роль: личные неурядицы, недовольство собой, отношения с властью. Маяковский, будучи гениальным поэтом, десять лет жизни отдал дешёвой пропаганде. Что касается Есенина, -- конечно он был больным человеком, уже на грани белой горячки, неоднократно лечился. А потом они были людьми суицидными. Правду о поэте нужно искать в его стихах. Сколько раз Есенин и Маяковский писали о самоубийстве? Ну вот...

В.Маяковский

С.Есенин

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

АРГУМЕНТЫ И ФАКТЫ

№ 12, 2009 г.

Валерий Леонтьев

Известный эстрадный певец Валерий ЛЕОНТЬЕВ о некоторых своих впечатлениях об Америке:

«... Главная особенность американского жизнеустройства -- в уверенности в завтрашнем дне. Рядовой американец планирует свою жизнь на много лет вперёд. Он достаточно точно представляет, когда заведёт семью, купит дом и куда поедет отдыхать, выйдя на пенсию. Он знает, что в случае непредвиденных обстоятельств о нём обязательно позаботятся. Мы же все живём в разной степени брошенными на произвол судьбы...

Ещё одно очень характерное отличие американского жизнеустройства от российского -- положение детей и стариков. В Штатах эти категории граждан всегда находятся в привилегированном положении. Детство в Америке охраняется очень сильно и буквально возведено в культ. Старикам в Штатах тоже грех жаловаться, причём не только американским. Мать моей приятельницы, всю жизнь прожившая в России, на старости лет в рамках регулярной акции правительства США вдруг выиграла вид на жительство - "грин-карту". Не проработав в Штатах ни одного дня, она получила от властей квартиру, достойную пенсию, медицинское обслуживание... Да что там говорить: её два раза в месяц возят в казино играть за счёт государства! У них так положено!

Я сейчас ни в коей мере не пытаюсь возвеличивать Америку. Просто говорю о том, что обидная незащищённость наших стариков и детей -- вовсе не норма. Штаты -- пример того, что бывает по-другому».

Главный редактор газеты "Аргументы и факты" Николай ЗЯТЬКОВ рассуждает о причинах мирового экономического кризиса:

Николай Зятьков

«...Если отрешиться от умных слов и экономических терминов, а посмотреть в суть проблемы, первопричиной стала жадность -- неумеренное потребление всего и вся. Западный мир нещадно эксплуатирует ресурсы всего земного шара. Только США до кризиса потребляли 40% (!) производимых В МИРЕ товаров и услуг. Сверхразвитые страны сконцентрировали у себя такое количество материальных ресурсов и роскоши, что сами себя загнали в тупик. Культ потребления требовал всё новых и новых товаров и денег. И на свет стали появляться различные финансовые схемы, в которых деньги не только множились на печатных станках, но и производились виртуальным способом в виде акций, облигаций и др. Они, в свою очередь, по много раз перепродавались, что неминуемо привело к финансовому краху.

Создавалось впечатление, что мир потребления реально сошёл с ума. Те, кто богаче, уже не удовлетворялись «банальными» автомобилями и яхтами за несколько миллионов долларов, а тратили по 5 миллионов -- за унитаз из платины и бриллиантов, по 20 миллионов за полёт в космос и проч. Те, кто победнее, набирали кредиты -- и тратили, тратили, тратили... В результате в США 60 млн. человек заразились «шопоголизмом» (страстью скупать нужное и не нужное) в опасной форме, в Европе -- 27 млн. человек. Суммарный долг американцев по кредитам составляет 876 миллиардов долларов. 30% из них не смогут вернуть заём.

Получается, что жадность сгубила не только самого «фраера», затеявшего всю эту «гонку потребления», а миллионы людей, которые потеряли работу, оказались в долгах...

Сейчас экономисты говорят, что остановку производства может спасти только возобновление спроса. Спроса на товары, услуги, продукты питания и проч. Но никто не знает, как этот спрос стимулировать. В Америке и других странах раздают беспроцентные кредиты, гасят задолженности. Фактически людям дают деньги, чтобы они хоть что-то начали приобретать. Но что захотят покупать люди, у которых всё есть? Например, на одну семью в США приходится 4 телевизора, уже в 2000 году там было 219 миллионов автомобилей: если их выстроить полосой в 10 рядов, то можно опоясать Землю 2,5 раза...

Когда человек не уверен в будущем, а при этом ему есть где спать, на чём ездить и что кушать, заставить его начать «активно потреблять» будет сложно...»

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

11.03.2009 г.

Долгожданным событием для агрогородка Дворец Дятловского района (Гродненская область) стало открытие бани, которая претендует на звание лучшей в сельской местности района. Только во внутреннюю отделку было вложено свыше 120 миллионов рублей, ещё около 100 миллионов планируется потратить на ремонт фасада и благоустройство территории. В новой бане невысокие цены, а ветераны и инвалиды здесь обслуживаются бесплатно.

-- А сколько стоит закодироваться от алкоголизма?
-- 300 тысяч.
-- Не-ет, уж лучше пропить!

Прозвішча падпісчыка

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

ПЕРАПРАВА ПРАЗ “ВОГНЕННУЮ РАКУ”

У міфалогіях многіх народаў свету рака (вогненная рака) была мяжой паміж светам жывых і светам памерлых. Гэты матыў даволі часта сустракаецца ў чарадзейных казках. Герой прыходзіць на бераг мора і просіць гаспадара чоўна перавезці яго на той бераг, каб паглядець, як там бацька (памерлы) жыве. Перавозчык патрабуе спачатку яму заплаціць. З далёкіх часоў у нас захавалася традыцыя: перад тым як апусціць труну з нябожчыкам у магілу (або адразу пасля апускання) сям’я памерлага (толькі яна, а гэта родныя першага і другога калена сваяцтва) кідае ў магілу грошы: робіць выкуп месца для цела памерлага, а таксама “аплачвае” пераправу душы на “той” свет.

Матыў дыстанцыравання свету жывых і “таго” свету (памерлых) і адмежавання іх ракой ці акіянам-морам шырока прадстаўлены ў надзвычай старажытных па паходжанні замовах і класічным казачным эпасе.

Цікава тое, што ў XIX і нават у XX стагоддзі на Беларусі захоўвалася абавязковая традыцыя: могілкі, якія, як правіла, знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці ад вёскі, адмяжоўвалі ад свету жывых глыбокім ровам, напоўненым вадой.

Студэнтка універсітэта культуры паведаміла сваю сямейную гісторыю і тым самым прапанавала паглядзець на грашовыя ахвяраванні зусім з іншага боку: *“Мая бабуля вучыла маю маці і мяне: родныя першай і другой ступені сваяцтва абавязкова кідаюць грошы ў магілу. Аднойчы я яе запытала: навошта? І тады бабуля расказала: “Калі хавалі маю маці, ніхто не кінуў у магілу грошай. Прайшло некалькі месяцаў і мне, яе дачцэ, сніцца сон: быццам я іду да маці ў госці. Баюся, але іду. Іду па вуліцы, а матуля расказвае: во гэта хата аднаго з нашых сваякоў, гэтая хата -- памерлага суседа. І вось мы падышлі да маленькай халупкі. Я пытаюся: матуля, а гэта чыя ж такая хатка? Яна і кажа: мая. Вы ж мне грошай пашкадавалі, вось цяпер і пакутваю, ад суседзяў сорамна, кажуць дрэнных дзяцей і ўнукаў выгадавала...”*

Харон -- перавозчык душ памерлых па водах Аіда
Малюнак Гюстава Дорэ

Марыя Іванаўна КАМІНСКАЯ (1928-2009)

10 сакавіка 2009 года на 82-м годзе жыцця памёрла Марыя Іванаўна Камінская.

Яна нарадзілася 16 студзеня 1928 года ў Брылях у сям’і Івана Максімавіча і Еўдакіі Сцяпанаўны Буглаковых і з самага маленства спазнала адвечны сялянскі лад жыцця. Гады ваеннага ліхалецця прынеслі ёй вялікія выпрабаванні і назаўсёды засталіся ў памяці. У пасляваенныя гады Марыя Іванаўна працавала ў калгасе імя Ільіча, а потым, сустрэўшы на сваім жыццёвым шляху Якава Максімавіча Камінскага з Малееўкі, пайшла за яго замуж. І пачало будавацца радзіннае гняздо, і у свет пайшлі трое дзетак. А непрадказальныя дарогі лёсу прывялі сям’ю Камінскіх на шырокія абсягі тагачаснага цаліннага краю, дзе прыйшлося шмат працаваць. А потым была зваротная дарога, і Магілёў гасцінна расчыніў свае цёплыя абдымкі. Тут Марыя Іванаўна працавала на ліфтабудаўнічым заводзе, выйшла на пенсію. І так сталася, што зноў пераехала жыць у родныя Брылі, дзе ўспамінамі быў абвеяны кожны пагорак. Усё вяртаецца на кругі свае...

Жыццё пралятае імклівай птушкай, а памяць застаецца...

Бывайце, Марыя Іванаўна!

АДНАВЯСКОЎЦЫ

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© “Брылеўскі летапіс”, 2009

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ